4. Ермаков, Д. С., Амантай, Ж. А. Модель мягких навыков. Современное образование и soft skills // Образовательная политика, 2021. – № 4. – С. 42–50.

5. Ермаков, Д. С., Амантай, Ж. А., Достатняя, А. А. К вопросу о роли «гибких» навыков в адаптации иностранных студентов в условиях интернационализации высшего образования // Непрерывная система образования «Школа – Университет». Инновации и перспективы: сборник статей VII Международной научно-практической конференции – Минск: Белорусский национальный технический университет, 2023. – С. 117–120.

УДК 741+378. 147 025. 7

## Творчасць як кампанент навучання і роля ў ім педагога

**Барбарчык М. І., дацэнт**
*Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

Анатацыя:

У артыкуле разглядаецца творчасць як кампанент сістэмы адукацыі , а таксама ўплыў асабістых педагагічных якасцей выкладчыка на працэс навучання.

Адукацыя, як і ўсе іншыя вобласці дзейнасці чалавека, з’ява сусветнай культуры. Яе значнасць вызначаецца той сапраўды велізарнай роллю, якую яна адыгравае ў выхаванні поўнацэннага члена грамадства. Гэта значыць чалавека здольнага прымаць актыўны і дзейны ўдзел, як у сацыяльным, так і працоўным жыцці.

Адной з галоўных фігур у сістэме адукацыі з’яўляецца выкладчык, які звычайна з’яўляецца спецыялістам у той ці іншай вобласці ведаў. Традзіцыйна лічыцца, што ў яго асобе павінна спалучацца два пачатку – вучоны і педагог, але змястоўным будзе дадаць і трэцці пачатак – творца. Першы пачатак прадугледжвае высокі інтэлектуальны патэнцыял. Другі – набыцце комплекса професійных ведаў. Трэцці – шэраг чалавечых якасцей, дазваляючых навучанне пераўтварыць у творчы працэс.

Творчасць – гэта мэтанакіраваная дзейнасць, уласцівая чалавеку, якая адметная сваей не ардынарнасццю, арыгінальнасццю і нестандартнасццю мыслення. Яна накіраваная на атрыманне новых істотных уласцівасцей і якасцяў звыклых працэсаў, вынікаў разумовай і практычнай працы. Творчасць так сама ў сябе ўключае рэалізацыю асабістых магчымасцяў у інтэлектуальна-эмацыйнай і прадметна-практычнай сферах.

Вышэй выклададзенае вызначэнне творчасці, як аднаго з бакоў прафесійнай жыццёдзейнасці чалавека, ў поўнай меры магчыма аднесці да дзейнасці педагога. Дарэчы традыцыйна да разраду творцаў далучаюць людзей занятых у сферы культуры і мастацтва. Гэта літаратура, музыка, архітэктура, выяўленчае мастацтва, дызайн і т. п. Работнікі, занятыя ў сферы адукацыі на законнай аснове, далучаны да разраду навуковых працаўнікоў, але ўсё ж такі і творчы пачатак у іх навуковай дзейнасці існуе.

Вызначальным у пачатку творчасці выкладчыка яго асновай з’яўляецца педагагічнае майстэрства – комплекс ведаў і якасцяў асобы, забяспечываючы высокі ўзровень самарэалізацыі ў прафесійна-педагагічнай дзейнасці. К кампанентам педагагічнага майстэрства Д. І. Вадзінскі адносіць наступныя якасці:

- гуманістычная накіраванасць, якая прадугледжвае наяўнасць інтарэсаў, каштоўнасцей, ідэалаў;
- прафесійныя веды прадмета і інавацыйнасць методыкі яго выкладання, садзейнючая аптымізацыі навучання і выхавання.

Неабходнымі ў творчым падыходзе да навучання маюць педагагічныя здольнасці выкладчыка. Да якіх трэба аднесці: камунікатыўнасць, перцэптыўнсць, дынамізм асобы, эмацыйная ўстойлівасць, крэатыўнасць.

Камунікатыўнасць адыгравае важкую ролю ў працэсе навучання, што прадугледжвае прыхільнасць да людзей, таварыскасць, што садзейнічае ўзнікненню даверлівага кантакта з аўдыторыей навучэнцаў, стварае дзелавую і творчую атмасферу. Заўважана, што калі выкладчык праяўляе добразычлівасць у дачыненні да сваіх калег альбо вучняў, то гэта стварае пазітыўную атмасферу ў калектыве, спрыяе нармальнаму і прадуктыўнаму правядзенню заняткаў.

Не малае значэнне ў педагогіцы мае перцэптыўнасць – прафесійная назіральнасць, якая дапамагае педагогу своечасова пры неабходнасці прысці на дапамогу разгубленаму вучню, своечасова

пазбегнуць канфліктных сітуацый, і выклікаць адпаведную эмпацію аўдзіторыі.

Дынамізм асобы – праяўляецца ў здольнасці выкліку і лагічнага пераканання, што дазваляе выкладчыку праяўляць гібкасць, ініцыятыўнасць, аптымізаваць вучэбны працэс. Звычайна педагогу даводзіцца сутыкацца з праявамі апатыі і інэртнасці, але яго здольнасць уздзеяння яго волі на навучэнцаў стымулюе і актывізуе вучэбны працэс.

Эмацыйная ў стойлівасць дазваляе педагогу зберагчы здольнасць валодаць сабой. У дадзеным выпадку самарэгуляцыя і самавалоданне дазваляюць падтрымліваць атмасферу надзейнасці і аптымізму ў час вучэбных заняткаў і пазбягаць канфліктаў, што будзе садзейнічаць як калектыву навучэнцаў, так і кожнаму асобна вучню больш паспяхова творча самарэалізавацца.

Для рэалізацыі ў адукацыйным працэсе паспяховага навучання важным з’являецца наяўнасць у ўсіх удзельнікаў творчых здольнасцяў. Так Д.І. Вадзінскі адзначае: “Творчество тесно связано со способностями. Творческие способности, будучи социально и педагогически детерминированными, развиваются на конкретной биологической основе” [2, с. 201]. На аснове гэтага выказвання даследчык падзяляе творчыя здольнасці на тры групы. Першая– звязаная з матывацыяй (інтарэсы, схільнасці); другая – звязаная з тэмпераментам (эмацыйнасць); трэцця – разумоўныя здольнасці.

Ва ўсялякім характары працы ўзнікае зацікаўленасць, калі змест дзейнасці выклікае інтарэс, які ўзмацняе матывацыю. Прычым аптымальны ўзровень матывацыіі не пастаянны, а ўзрастае з павышэннем складанасці заданняў. Заўважана, што калі выкладчык ставіць перад вучнямі больш складаныя задачы, то інтэнсіўнасць дзейнасці вучняў над іх вырашэннем узмацняецца. Не сумненна, што матывацыя навучэнцаў узмацняецца, калі педагог з’яўляецца для іх аўтарытэтам. Сфарміраваць вучня як творчую асобу можа толькі той выкладчык, які сам працуе творча і які здольны стварыць вучэбную сістэму праблем і праблемных задач, рашэнне якіх будзе садзейнічаць развіццю творчага мыслення вучняў.

Не магчыма ўявіць творчую дзейнасць без эмацыйнасці, якая напрамую залежыць ад тэмперамента чалавека. Тэмперамет у сваю чаргу з’яўляецца прадуктам псіхафізічных якасцей чалавека. Вядома, што па сваім псіхафізічным якасцям людзі падзяляюцца на чатыры

тыпы: сангвінікі, халерыкі, флегматыкі, меланхолікі. Для вакладчыка важна ўмець распазнаць псіхафізічную адметнасць кожнага свайго вучня, якая праяўляецца  у час навучання. Гэта дапамагае настаўніку ў стасунках вучнямі рабіць правільны педагічны падыход да кожнага. Умела здзейсняць індывідуальны кантроль у час ваканання заданняў навучэнцамі. Напрыклад, сангвінікі і асабліва халерыкі пры вырашэнні пэўнай вучэбнай задачы праяўляюць жывасць успрымання інфармацыі, актыўна і паспяхова выконваюць заданне, з цягам часу губляюць інтарэс. У іх дзеяннях паяўляецца інэртнасць, не паслядоўнасць. У такіх выпадках выкладчык павінен праяўляць здольнасць на працягу заняткаў падтрымліваць у навучэнцаў матывацыю, зацікаўленасць, крэатыўнасць. Флегматыкі, наадварот, на працягу ўсяго часу заняткаў да выканання заданняў падыходзяць вельмі грутоўна і сур'ёзна, але спачатку іх выканання, намагаючыся усё прадугледзіць і выканаць правільна і дакладна, марудзяць час. І тут выкладчыку трэба своечасова нагадаць пра абмежаванасць тэрміну заняткаў. Парой нерашучасць і разугубленасць вучня-меланхоліка патрабуе з боку настаўніка пільнай увагі і падтрымкі.

Разумовыя здольнасці вызначаюцца якасцю мыслення, якое ў сваю чаргу мае шэраг псіхалагічных кампанентаў. Такіх, як мабільнасць думкі, мэтанакіраванасць, уяўленне, воля, памяць. Мабільнасць мыслення дазваляе, як выкладчыку, так і вучню сканцэтраваць веды і вопыт для вырашэння вучэбных задач. Важнай якасцю тут выступае хуткасць мыслення, гэта значыць здольнасць за кароткі час правесці аналіз атрыманай інфармацыі з наступнымі абгрунтаванымі вывадамі. Гэта асноўны шлях развіцця творчага мыслення, які прывядзе да практычных дзеянняў, патрабуючых прыняцця рашэння.

Здольнасць удзельнікаў адукацыйнага працэсу мабілізаваць думку і накіраваць яе на вырашэнне пэўнай мэты, неадцягваясь і не прыпыняючы пошуку рашэння з'яўляецца мэтанакіравнасцю, якая неабходная ў творчасці. І тут патрэбная, як выкладчыку, так і вучням самастойнасць, якая дае магчымасць прымаць рашэнні і дзейнічаць у адпаведнасці з асабістымі поглядамі і перакананнямі, не гледзячы на ўплыў процілеглых меркаванняў.

З воляй спецыяліста звязана, як мысленне, так і яго вынік – творчасць. Воля, уплываючы на працэс мыслення творцы, надае яму у яго дзеяннях актыўнасць і настойлівасць. У гэтым выпадку вялікую

ролю адыгравають індывідуальныя і інтэліктуальныя пачуцці чалавека: здзіўленне, сумненне, ўпэўненасць, дапытлівасць, якія стымулюць актыўнасць работы думкі. Пачуцці ўплываюць на творчыя дзеянні як выкладчыка, так і будучых спецыялістаў – яго вучняў.

Важным кампанентам у творчасці мае ўяўленне. Сваёй крыніцай уяўленне мае аб’ектыўную рэальнасць, якая дазваляе ўдзельнікам адукацыйнага працэсу ствараць новае і арыгінальнае. Ўяўленне неабходнае навукоўцам, як у практычнай, так і тэарэтычнай дзейнасці.

У творчасці важная роля належыць памяці. Чалавек у стане гатоўнасці памяці здольны апазнаваць і ўнаўляць у працэсе навучання тую інфармацыю, якая ў дадзены момант патрэбная яму для выканання пэўных задач. Важнае месца ў працэсе творчасці займае хуткасць вымання з памяці неабходнай інфармацыі. Гатоўнасць памяці, як настаўніка, так і вучня, важкая ўмова прадуктыўнай творчасці.

Разумовая актыўнасць вызначаецца не толькі ўзроўнем ведаў, але так сама залежаць ад ступені авалодання навучэнцамі інтэлектуальнымі дзеяннямі ў спалучэнні з практычным вопытам. Паказальна паспяховымі з’яўляюцца вучні з высокімі інтэлектуальнымі здольнасцямі, а таксама з вялікім аб’ёмам практычных ведаў па вучэбным прадметам. Паспяховасць вучэбнай работы пры выкананні вучнямі розных практычных задач і заданняў у рашаючай ступені залежыць ад асобы выкладчыка. Яго здольнасці прафесійна, інавацыйна падрыхтаваць вучэбны матэрыял і крэатыўна арганізаваць вучэбны працэс. На вырашэнне гэтых адукацыйных праблем робяць уплыў пэўныя чалавечыя якасці творчай асобы. Гэта, у першаю чаргу, праява вялікай працаздольнасці ў той галіне, ў якой спецыяліст працуе. Важнай якасцю выкдчыка таксама з’яўляецца жывасць розуму, якая дазваляе засяродзіць увагу на пэўнай праблеме. Гэта несумненна самабытнасць як праява здольнасці ствараць сваё і непаўторнае.

Зыходзячы з вышэй сказанага, трэба адзначыць, што інтарэсы выкладчыка, яго каштоўнасці і ідэалы, якія маюць гуманістычную накіраванасць, з’яўляюцца арыенцірам у адукацыі і выхаванні вучняў, а ў далейшым, магчыма, іх жыццёвым крэда. Ад асобы выкладчыка, яго захопленасці, здольнасці ўдзельнічаць у

сутворчасці залежыць эфектыўнасць адукацыі. Развіццё крэатыўнасці навучэнцаў іх выхавання будзе паспяхова ажыццяўляцца тады, калі асновай педагагічнага ўздзеяння на ўсіх этапах навучання будзе галоўны прынцып, які вызначае развіццё чалавецтва, – творчасць.

## Спіс выкарыстаных крыніц:

1. Митина, Л. М. Психология профессионального развития учителя / Л. М. Митина. – М., 1998. – 344 с.

2. Водзинский, Д. И. Педагогика высшей школы: монография / Д. И. Водзинский. – Мн., 2000. – 372 с.

3.Козубовский В. М. Общая психология: конспект лекций / В. М. Козубовский. – Мн., БГПУ им М. Танка, 2001. – 96 с.

УДК 159.923:373.57

# Мотивация как необходимое условие успешной учебной деятельности

**Бируля И. А., к. п. н., доцент**

*Белорусский государственный университет*

*г. Минск, Республика Беларусь*

Аннотация:

В статье говорится о необходимости формирования мотивации для успешного обучения в системе довузовского образования. Автор акцентирует внимание на особенностях учебной деятельности, методах работы по ее активизации на занятиях по русскому языку.

Одним из значимых событий в процессе модернизации системы образования в Республике Беларусь является введение единого экзамена, призванного объединить выпускные экзамены в учреждениях общего среднего образования (УССО) со вступительными экзаменами в учреждения высшего образования (УВО) и стандартизировать оценку знаний, умений и навыков. В этом нововведении хочется выделить такие положительные моменты, как наличие единых критериев оценивания тестовой работы и присутствие заданий разного